сябрыне таго самага дня, палуднуючы, пасінелі й паваліліся два іншыя чалавекі; гэтыя не памерлі толькі дзякуючы таму, што лучыўся ўзумелы чалавек, што ўжо бачыў такія стацыці. Іх разьдзелі да гала й дзяржалі жыватамі перад гарачым цяплом. Сяброве назіралі, як із вытапляных нашэньнікаў валіла пара, яны засталіся жывыя. (Н. Лесков. Собрание сочинений, IV. Масква, 1957, бач. 304—305).

У другім месцу Ляскоў піша:

Якая гэта была хвароба (ув Арле. — зацем перакладніка), навукова не азначана, але простыя людзі яе звалі „пазуха“, або „верад“, або „пупырух“. Пачалося гэта з багатых збожжам паветаў, ідзе, ня маючы хлеба, елі канапляную макуху. У Карачэўскім а Бранскім паветах, ідзе сяляне мяшалі жменю мукі зь нявеянага збожжа з тоўчанай карою, была хвароба іншая, таксама сьмяротная, але „пупырух“. „Пупырух“ паказаўся спачатку на статку, а потым прыкідаўся людзём... Выскача на целе малая скулка, званая простымі людзьмі „пупырушок“, пажаўцее яе вяршок, навокал зачырванеецца, і за пару пачынае цела гніць, а потым і борзда сьмерць (там жа, VI, бач. 363).

**Зацем.** Апісанае гэта Лясковам у вабодвых мясцох было ў вапошняй чэцьверці дзевятнанцатага стагодзьдзя. Як відаць із назоваў мясцовасьцяў і беларускіх „белых магерак“, апісаны тут Лясковам пераважна дагэтуль незрусыфікаваныя Беларусы.

# Ведамкі праз тое, што й як было ў Расіі

У часе Крымскае вайны Мікола І аднойчы сказаў наступніку пасаду, Аляксандру Мікалаёнку: „І мне здаецца, што ў усёй Расіі адно ты а я не крадзем“ („Исторический вестник“,1884, т. 18, бач. 624).

Другі аўтар адцямляе: „Тульская шаша да таго была нягодна пракладзена, што за год па зданьню яе губэрнскаму ўраду разьлезлася“. Коміся, прызначаная да прасокі гэтае справы вінных не знайшла, і Мікола І напісаў на рассудку ейным: „Шашы няма, грошай няма, і вінных няма: хоця–няхоця справу маем скончыць, і шашу нанава пракладаць“ (Исторические рассказы и анекдоты // Русская старина, 1879, т. 26, бач. 217).

# Каля Саўчыца

На ліст сп. А. Калодкі ў справе ліхадзействаў П. Саўчыца, выдрукаваны ў № 2 „Незалежніка“, а. прот. М. Лапіцкі ўважаў за патрэбнае адказаць 6 сакавіка сёлета на зьездзе сяброў Бэлер Менску. Асьветчыўшы галаслоўна, што ў лісьце сваім сп. Калодка напісаў няпраўду, ён далей казаў, што Немцы толькі крыміналістых ссылалі да концэнтрацыйных табараў, а палітычных стралялі на месцу. Гэта ані ня згодна з праўдаю. Кажны, хто жыў у Вялікалітве за нямецкае окупацы, ведае, што гітлераўцы ані не каралі крыміналістых, калі толькі яны не рабілі шкоды Немцам. Яны ведалі добра, што неморальных лягчэй зьнішчыць, чым моральных, і затым патуралі неморальнасьці. Калі ж хто зрабіў самым Немцам хоць бы найменшую шкоду, таго каралі на месцу, звычайна стралялі. Падазроных жа палітычна або ў магчымасьці палітычнага шкоджаньня Немцам, яны высылалі да концэнтрацыйных табараў. Цяжка паверыць, каб а. протоерэй гэтага ня ведаў, жывучы ў Вялікалітве за нямецкае окупацы. Сказанае ж ім гэта ў зьвязку зь лістом сп. А. Калодкі, былога вязьня концэнтрацыйных табараў, выглядае няхораша, неморальна. Судзі Божа й людзі! Свае асьветчаньне а. Лапіцкі скончыў, сказаўшы, што Касьцянцін Касяк — швагра ягоны.